# Дабрыня, гуманізм і

## *Дыялог цывілізацый на XXXI Мінскім міжнародным кінафестывалі «Лістапад»*

**У Беларусі завяршыўся тыдзень вялікага кіно: з 31 кастрычніка да 7 лістапада па ўсёй краіне адбылося больш за 600 паказаў, на якіх пабывала звыш 25 тысяч чалавек. Падчас фестывалю праводзіліся круглыя сталы, творчыя сустрэчы і майстар-класы, у сталіцы таксама адбыліся Дні нацыянальнага кіно. Прайшлі і рэтраспектыўныя паказы: з нагоды юбілею Вялікай Перамогі дэманстраваліся стужкі з залатой калекцыі краін СНД, прысвечаныя ваеннай тэматыцы.**

**Увогуле на вялікіх экранах дэманстраваліся работы больш як з 40 краін свету. Такім чынам беларуская публіка змагла далучыцца да кінематографа Расіі, Кітая, Індыі, Ірана, Пакістана, Венесуэлы, В'етнама, краін Еўропы, а госці пазнаёміцца з кінамастацтвам нашай краіны.**



Фота Ірыны Прымак.

*Чжан Чжун.*

Спецыяльны прыз Прэзідэнта Беларусі «За гуманізм і духоўнасць у кіно» ўручаецца на цырымоніі закрыцця Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» у самым пачатку. Гэта адразу задае высокую планку і падкрэслівае кірунак, якога прытрымліваецца наша дзяржава, – гуманізм і духоўнасць. Уладальнікам узнагароды сёлета стаў кітайскі рэжысёр Чжан Чжун (ён атрымаў Гран-пры на мінулым юбілейным форуме за карціну «Чан'ань, Сіань») за фільм «Гісторыя баваўняных палёў». Спецыяльны прыз уручыла намеснік прэм'ер-міністра Наталля Пяткевіч.

«Для мяне гонар атрымаць такую высокую ўзнагароду, а быць адзначаным другі год запар – наогул вялікае дасягненне, – прызнаецца Чжан Чжун. – І ўсё ж гэты поспех не толькі мая заслуга, а вынік усебаковага стратэгічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Кітаем».

Гран-пры «Золата Лістапада» за найлепшы фільм сёлета прысуджаны расійскай стужцы «Паляўнічы» рэжысёра Заура Цагоева.



*Кадры з фільма «Гісторыя баваўняных палёў».*

## «БЕЗЗАПАВЕТНА СЛУЖЫЦЬ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ»

**У дзень закрыцця «Лістапада» адбылася яшчэ адна значная падзея. Падчас прэс-канферэнцыі першы намеснік міністра культуры Беларусі Дзмітрый Шляхцін уручыў Віншаванне Прэзідэнта народнаму артысту Беларусі Анатолю Іванавічу Алаю з нагоды яго 85-годдзя. «Дзякуючы таленту і неверагоднай працаздольнасці Вы стварылі шэраг кінастужак, якія захапляюць гледачоў глыбокай мастацкай задумкай і выклікаюць моцныя пачуцці, – гаворыцца ў віншаванні. – Спадзяюся, што Вы і ў далейшым будзеце гэтак жа плённа і беззапаветна служыць беларускай культуры».**

Анатоль Алай падзякаваў і дадаў, што верыць у патэнцыял беларускіх дакументалістаў, якія яшчэ заявяць аб сабе. «Хочацца, каб наша дакументалістыка працавала на міжнародным узроўні, як і раней», – заўважыў юбіляр.

Народны артыст Беларусі Анатоль Алай – лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта за стварэнне цыкла дакументальных фільмаў аб Вялікай Айчыннай вайне. Фільмаграфія Анатоля Іванавіча налічвае больш за 100 карцін.

Падчас прэс-канферэнцыі Дзмітрый Шляхцін таксама адзначыў вялікую ролю Мінскага міжнароднага кінафоруму: "«Лістапад» – вялікая, сур'ёзная, шматгранная з'ява, якой мы ўдзяляем шмат увагі і заўсёды імкнёмся падрыхтаваць фестываль на вельмі высокім узроўні. "Лістапад" – гэта не проста конкурсныя паказы і творчыя спаборніцтвы, але яшчэ і наладжванне дзелавых кантактаў паміж прадстаўнікамі кінасферы з розных дзяржаў, якія ў будучыні змогуць прывесці да сумесных праектаў. Слоганам сёлетняга "Лістапада" сталі словы "Гісторыя, якая мяняе погляд". Вельмі хочацца верыць, што гэтыя сем дзён дапамаглі жыхарам і гасцям Беларусі зірнуць на свет па-новаму, праз прызму дабрыні, гуманізму і духоўнасці. Безумоўна, многія фільмы, якія былі паказаны як у конкурснай, так і ў пазаконкурснай праграме, сталі своеасаблівым акном у іншыя сусветы, цывілізацыі і культуры. Усё дзеля таго, каб мы лепш пачалі разумець адзін аднаго».

## Уражанні

**Дзмітрый Сямёнаў, генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм»:**

– Уражанні ад сёлетняга «Лістапада» самыя яркія! Была праведзена напружаная праца, каб арганізаваць фестываль на такім высокім узроўні, каб была настолькі насычаная праграма. Мы паглядзелі шмат якасных і цікавых фільмаў. Важны элемент «Лістапада» – творчыя сустрэчы і майстар-класы для студэнтаў. Усе залы заўсёды былі поўныя, задаваліся шмат цікавых пытанняў, вяліся жывыя дыялогі. Усё гэта гаворыць аб тым, што наша моладзь, якая неўзабаве сама прыйдзе працаваць у кіно, зацікаўлена ў сустрэчах з мэтрамі. А значыць, у нас падрастае добрая будучыня кінематаграфіі. Хачу падзякаваць нашаму міжнароднаму журы, бо на яго плечы легла самая цяжкая праца – ацэньваць конкурсныя фільмы. Варта адзначыць работу Міністэрства культуры Беларусі і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, нашых партнёраў, якія дапамагалі арганізаваць гэтае свята кіно. Цяпер у нас наперадзе – вялікая праца, каб асэнсаваць усё, бо хочацца, каб у далейшым фестываль развіваўся, а ў нашых гледачоў і гасцей было яшчэ больш яркіх эмоцый і прыемных уражанняў.

**Дзмітрый Астрахан, рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі:**

– Для мяне «Лістапад» заўсёды такі цёплы і святочны. Дзякуючы падтрымцы гледачоў на ім я калісьці атрымаў галоўную ўзнагароду за свой фільм «Усё будзе добра!», таму мне заўсёды прыемна вярнуцца ў Мінск. На беларускай кінастудыі я зняў вельмі шмат карцін. Сёлета з радасцю прыехаў на майстар-клас для студэнтаў БДУКМ. Больш за ўсё мне падабаецца душэўнасць і адкрытасць «Лістапада», ён нейкі чалавечны. Нават журы ацэньвае работы ў адной зале з гледачамі. І ў гэтым таксама ёсць адрозненне ад іншых фестываляў. Кіно на «Лістападзе» ў першую чаргу для гледача.

**Івана Жыгон (Сербія), старшыня журы конкурсу «Кіно маладых»:**

– Кіно маладых, якое мне давялося глядзець і ацэньваць, – гэта фільмы, якія складаюцца з самых, здавалася б, простых рэчаў, – момантаў цеплыні, чалавечай прастаты. Яны не гоняцца за бюджэтам і амбіцыямі, а канцэнтруюцца на галоўным — чалавечых каштоўнасцях, дзеля якіх мы і жывём і застаёмся людзьмі. Мы ўсе пабачылі ў Мінску, як на гэтым свяце сёння нараджаецца новы свет, які цэніць у чалавеку чалавека.

# духоўнасць

## УДЗЯЧНАСЦЬ ГЛЕДАЧАМ

Закрыццё «Лістапада-2025» прайшло ў абноўленым кінатэатры «Масква». Гэта было ўрачыста і ярка! Праграма ўключала шэраг прыгожых і інтрыгоўных момантаў. Героямі, вядома, сталі рэжысёры, акцёры – усе тыя, хто стварае фільмы, якія радуюць, натхняюць, прымушаюць задумацца над самымі рознымі пытаннямі, матывуюць... Эмоцыі ва ўсіх былі шчырыя. І ўсё ж самым кранальным момантам сёлетняй цырымоніі закрыцця «Лістапада» стаў выхад на сцэну народнага артыста Беларусі Уладзіміра Гасцюхіна.

Акцёр выйшаў не толькі атрымаць прыз як найлепшы выканаўца мужчынскай ролі ў ігравой стужцы («Мой дзед»). Сваім пранізлівым маналогам Уладзімір Васільевіч, па сутнасці, развітаўся з вялікім кіно і сваім гледачом, пасля яго слоў зала ўстала, многія сапраўды плакалі. «На жаль, час бярэ сваё. Я ўдзячны ў першую чаргу гледачам, бо служыў вам, – прызнаўся артыст. – Мне цяпер прыгадваецца карціна «Усё застаецца людзям», бо ўсё, што рабіў, сапраўды застаецца вам... Я таксама ўдзячны журы, якое ацаніла маю работу ў фільме «Мой дзед». Роля мне далася вельмі цяжка. Пэўна, больш такіх намаганняў дзеля фільма я не змагу прыкласці, таму гэтая работа – маё развітанне... Я шмат гадоў выходзіў на сцэну Мінскага тэатра-студыі кінаакцёра. І вельмі ўдзячны гледачу за наша тэатральнае мінулае».


Фота БелТА.

Фільм «Мой дзед» – работа расійскага рэжысёра Святаслава Уласава. Гэта душэўная карціна, якая нагадвае аб тым, што варта задумацца пра сваіх блізкіх. Уладзімір Гасцюхін назваў стужку запрашэннем да роздуму на тэму сямейных каштоўнасцей, бо за кожным стаяць цэлыя пакаленні, чые сямейныя гісторыі робяць нас тымі, хто мы ёсць сёння.

Дарэчы, стужка «Мой дзед» атрымала прыз глядацкіх сімпатый (яго ўручалі народны артыст Беларусі Аляксандр Яфрэмаў і юная спявачка Амалія Сухан). І гэта сапраўды сімвалічна, што мінская публіка ацаніла ігру Уладзіміра Гасцюхіна ў адной з яго фінальных карцін... Верыцца, што артыст, калі нават і не здымецца больш у кіно, яшчэ паспее перадаць свой вопыт маладому пакаленню акцёраў.

Карціне «Мой дзед» таксама прысуджаны прыз Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы «За ўклад у захаванне духоўна-маральных і культурна-гістарычных каштоўнасцей».


Фота Ірыны Прымак.

## ХТО ЯШЧЭ АДЗНАЧАНЫ?

Найлепшым фільмам асноўнага конкурсу неігравых стужак названы «Мікіта» Мікалая Бурляева і Дзмітрыя Чарняцова. Сярод анімацыйных работ перамагла «Казка Іскаркі» расійскага рэжысёра Анастасіі Ліс. Найлепшая карціна ў конкурсе нацыянальных кінашкол – стужка Кіры Неміровіч-Данчанка «Але любоў з іх большая». За найлепшы неігравы фільм Нацыянальнага конкурсу адзначана рэжысёр Анжаліка Новікава за работу «Жыццё маё – "Харошкі". Валянціна Гаявая». Найлепшая карціна сярод караткаметражак (гэты конкурс сёлета праводзіўся ўпершыню) – «Сапсаваная вясна» рэжысёра Цю Юй (КНР).

Народная артыстка РСФСР Святлана Кручкова атрымала прыз за найлепшую жаночую ролю ў ігравым фільме «Двое ў адным жыцці, не лічачы сабакі».

Прыз за найлепшую рэжысуру ігравога фільма імя Міхаіла Пташука – у карціны «Адлюстраванні № 3» Крысціяна Петцольда (Германія). Прыз за найлепшую аператарскую работу ў ігравым фільме імя Юрыя Марухіна дастаўся Мартэза Кафуры (Іран) за стужку «Над прорваю ў жыцці». Прыз за найлепшы фільм конкурсу «Кіно маладых» імя Віктара Турава прысуджаны іранскаму рэжысёру, які стварыў «Бананавы сад», – гэта Рэза Кешаварз Хадад. Узнагароду імя Валерыя Рубінчыка за найлепшую рэжысуру фільма конкурсу «Кіно маладых» атрымала японска-амерыканская работа Неа Сора «Шчаслівы канец».

Дыплом «За яркае адлюстраванне ідэй патрыятызму ў нацыянальным кіно» атрымаў фільм «Душа абаронцы» беларускага тэлевядучага Рыгора Азаронка.

Дыплом за памяць аб ахвярах малых народаў у Другой сусветнай вайне ўручылі за стужку «Тата бука» Біджукумара Дармадарана (Індыя, Папуа-Новая Гвінея).

Дыплом за ўвасабленне духу апакаліпсіса і вобразаў сучасных еўрапейцаў пад белым сонцам пустыні дастаўся карціне «Сірат» рэжысёра Олівера Лашэ (Францыя, Іспанія).

Спецыяльны прыз журы конкурсу ігравых стужак – у карціны «Вяселле на базары» рэжысёра Келіму Абулізі (КНР).

Прыз за найлепшае гукавое (музычнае) рашэнне ігравога фільма прысуджаны стужцы «Алі Прымера» Мануэля Барыоса і Эдуарда Гансалеса (Венесуэла).

Спецыяльны прыз выканаўчага камітэта СНД за развіццё культурнага супрацоўніцтва і ўмацаванне сяброўства паміж народамі «Кіно без межаў» уручаны беларускаму фільму «Пераломны момант» Дзмітрыя Сарокі (пра гэтую работу мы падрабязна распавядалі ў мінулым нумары «ЛіМа»).

Прыз Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта прысуджаны расійскай карціне «Двое ў адным жыцці, не лічачы сабакі» Андрэя Зайцава.

Спецыяльны дыплом Выканаўчага камітэта СНД атрымаў фільм «Хлеб» Эльдора Шадманкулава (Расія).

Спецыяльны прыз Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі «За вернасць маральным ідэалам у кінамастацтве» прысуджаны фільму «Мая Плісецкая, якую мы не ведалі» рэжысёра Мікалая Ефімовіча.

Дыпломам за найлепшае ўвасабленне дэвіза фестывалю «Гісторыя, якая мяняе погляд» адзначаны фільм «Далікатная кветка» в'етнамскага рэжысёра Май Тху Хуэйен.

Пераможцай «Лістападзіка-2025» стала карціна «Планета 7693» рэжысёра Гойка Беркуляна (Чарнагорыя).

Узнагароды знайшлі сваіх уладальнікаў (прызоў, канешне, значна больш, чым мы пералічылі). XXXI Мінскі міжнародны фестываль, які прайшоў на высокім узроўні, ужо стаў гісторыяй. Але сустрэча з вялікім кіно зноў адбудзецца праз год, каб чарговы раз падарыць усім нам свята і паказаць прыклад міру і згоды ў кінематаграфічным свеце і, хочацца верыць, у свеце наогул. Кіно сёння – больш чым звычайная забава – гэта тая агульная мова, якая патрэбна, каб народы з самых розных краін аб'ядналіся і жылі ў згодзе. Кінематаграфічны палілог, які адбыўся цяпер у беларускай сталіцы, і быў дзеля міру.


Фота БелТА.

**Матэрыялы Ірыны ПРЫМАК**